# ШКОЛА – ВНУ: ПРАЦУЕМ РАЗАМ




Чарговае адкрытае пасяджэнне студэнцкага навуковага гуртка «Мова ў кантэксце культуры» прайшло на філалагічным факультэце напрыканцы лютага. Нагодай для сустрэчы стаў Міжнародны дзень роднай мовы, які шырока адзначаецца ва ўсім свеце. Гасцямі пасяджэння сталі навучэнцы 9-х, 10-х і 11-х класаў сярэдняй школы № 4 г. Віцебска разам з настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Вольгай Сцяпанаўнай Зязюлькінай.

У прывітальным слове кіраўнік гуртка – загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Генадзь Антонавіч Арцямёнак распавёў пра факультэт, спецыяльнасці, на якіх можна вучыцца, адказаў будучым абітурыентам на іх пытанні, што датычыліся ўмоў паступлення на ФлФ і падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання.

Працягнула размову з гасцямі дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Алена Сяргееўна Дзядова, якая загадвае філіялам кафедры на базе школы № 4. Яна паведаміла, што, дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву школы і ВНУ, старшакласнікі становяцца пераможцамі конкурсаў навуковых прац і раённых прадметных алімпіяд. А некаторыя з навучэнцаў прымаюць рашэнне паступаць у наш універсітэт, што яшчэ раз пацвярджае неабходнасць існавання філіяла.

Аўтар дадзенага матэрыяла расказала пра гісторыю свята, а таксама пра імкненне сусветнай супольнасці захаваць моўную разнастайнасць на планеце, бо кожная нацыянальная мова – гэта не толькі скарб аднаго народа, але і ўсяго чалавецтва.

Затым прысутныя ўдзельнічалі ў віктарынах: называлі аўтараў знакамітых цытат пра родную мову, працавалі з беларускай лексікай, успаміналі любімыя родныя словы (большасць удзельнікаў назвала слова «дранікі»).

Падчас сустрэчы ўзгадалі, што сёлета ў студзені споўнілася 125 год з дня нараджэння Браніслава Тарашкевіча – стваральніка першай «Беларускай граматыкі для школ» (1918), якая мела істотнае значэнне для развіцця і нармалізацыі беларускай мовы. Пра асобу Браніслава Адамавіча і яго трагічны лёс прысутныя даведаліся ўпершыню. Мы ж пажадаем маладым людзям новых везаў і адкрыццяў на светлым шляху да навукі!

**Кацярына ПІВАВАР,**
**староста гуртка.**